**Список литературы**

1. В битве за Москву: Иванов Пётр Самсонович // Лотошинский историко-краеведческий музей. – URL: https://museum-lot.mo.muzkult.ru/news/ 120560374 (дата обращения: 25.02.2026).

2. Иванов, Пётр Самсонович // Рувики. – URL: https://ru.ruwiki.ru/wiki/Иванов,_Пётр_Самсонович (дата обращения: 07.02.2026).

3. Иванов Пётр Самсонович // Хронос. – URL: https://hrono.ru/biograf/bio_i/ivanovps.php (дата обращения: 23.02.2026).

4. Иванов Пётр Самсонович // Память народа. – URL: https://pamyat-naroda.ru/heroes/kld-card_kld417968/ (дата обращения: 25.02.2026).

5. Иванов Пётр Самсонович // Офицеры РИА. – URL: https://ria1914.info/index.php?title=Иванов_Петр_Самсонович (дата обращения: 03.02.2026).

## ГЕРАІЧНЫЯ СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ ВІШНЯЎЦА Ў ЭКСПАЗІЦЫІ ШКОЛЬНАГА МУЗЕЯ

**Гядзейка К.А.**

Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы

г. Гродна, Республика Беларусь

Навуковы кіраўнік – канд. філал. наук, доц. Ляскевіч С.Г.

**Актуальнасць.** Памяць пра Вялікую Айчынную вайну мае для нас, беларусаў, асаблівае значэнне. Гэтая трагедыя і гэты подзвіг кранулі кожнага чалавека, кожны куток нашай зямлі захоўвае і ў наш час сведчанні падзей той далёкай гісторыі. Сёння, калі жывых сведкаў мінулых падзей застаецца ўсё менш, адказнасць за захаванне памяці, перадачу яе іншым пакаленням, бяруць на сябе музеі. І роля школьных музеяў тут вельмі важная, бо самі вучні ўдзельнічаюць у стварэнні музейных экспазіцый, выступаюць экскурсаводамі, і тым самым напрамую судакранаюцца да гісторыі.

**Мэта.** Музейны пакой «Гісторыя Вішняўца» ў сярэдняй школе № 34 г. Гродна быў адкрыты 7 мая 2010 года. Гэта гісторыка-краязнаўчая экспазіцыя, галоўная мэта якой – паказаць новаму пакаленню гісторыю мінулых гадоў, фарміраваць грамадзянска-патрыятычную свядомасць вучняў [1]. Падчас экскурсіі можна даведацца пра ўзнікненне мікрараёна Вішнявец, асноўныя этапы яго развіцця. У межах нашага артыкула мы разгледзім, якім чынам у музеі раскрываецца тэма Вялікай Айчыннай вайны і захоўваецца памяць пра подзвіг тых, хто змагаўся з захопнікамі.

**Метады даследавання.** Крыніцамі фактычнага матэрыялу выступаюць фонды музея, якія змяшчаюць 99 экспанатаў, з якіх 45 адносяцца да асноўнай экспазіцыі. Тэмы Вялікай Айчыннай вайны датычацца некалькі



Репозиторий ГрГМУ

раздзелаў: 1) «Лёсы, апаленыя вайной», 2) «У гады акупацыі», 3) «Гераічныя старонкі Вішняўца».

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Раздзел «Лёсы, апаленыя вайной» прысвечаны сваякам настаўнікаў і вучняў школы, чые лёсы абпаліла вайна. Адзін з іх – Стэльмак Аркадзь Васільевіч (1923–1982), ефрэйтар, сапёр, які прайшоў шлях да Берліна і быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «За адвагу». Побач – гісторыя Саўко Мікалая Андрэевіча (1923–1945), стралка, які загінуў у баі 9 красавіка 1945 года і пахаваны ў брацкай магіле ў Калінінградскай вобласці. Гэты чалавек – частка гісторыі сям'і вучаніцы 11 класа Міхальчэні Валерыі. Змагаўся за перамогу і Аўрамаў Іван Лукіч (1914–1988), палкоўнік авіяцыі. Ён пачаў сваё змаганне ў Маскве, дзе і вучыўся ў летняй акадэміі, а скончыў яго на Далёкім Усходзе; узнагароджаны шматлікімі ўзнагародамі, у тым ліку і двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і ордэнам Айчыннай вайны I ступені, што гавораць аб тым, што гэты чалавек быў героем сваей краіны. Прадстаўленыя ў экспазіцыі і матэрыялы пра жанчын, што таксама ваявалі. Так, Ігнатовіч Вольга Цярэнцьеўна (1925–1998). Васямнаццацігадовай дзяўчынай яна трапіла ў партызанскі атрад імя Катоўскага, дзе ёй прыйшлося змагацца супраць акупантаў на Палессі, была ўзнагароджана і ў тым ліку ордэнам Айчыннай вайны II ступені. Пасля вайны жанчына працавала ў калгасе, выхоўвала дзяцей Вольга.

У лістападзе 2024 года экспазіцыя была пашырана за кошт новых матэрыялаў фотавыставы «Ваш подвиг жив, неповторим и вечен!». Сучасныя тэхнічныя сродкі дазваляюць наведвальнікам больш падрабязна даведацца пра жыццёвы і баявы шлях кожнага героя праз размяшчэнне побач з кожным фотаздымкам QR-кода.

Каб перадаць тэму акупацыі, у экспазіцыі «У гады акупацыі» знаходзяцца рэчы фашыстаў, прапагандысцкія лістоўкі, якія фашысты скідвалі з самалётаў чырвонаармейцам, каб падарваць іх маральны дух.

Стрыжнёвая экспазіцыя «Гераічныя старонкі Вішняўца» распавядае пра подзвіг воінаў 85-й стралковай дывізіі, якая першая прыняла ўдар фашыстаў у чэрвені 1941 года. Многія з экспанатаў перадалі з раскопак на месцы чацвёртага форта, дзе сустрэла вайну 85-й стралковая дывізія пад камандаваннем генерал-маёра А.В.Бандоўскага. Гэтая дывізія сустрэла фашыстаў у ноч з 23 на 24 ліпеня і пачала свой паход з пункта каля ракі Свіслач наступам на Гродна. Прыкладна 1000 чалавек памерла на тэрыторыі весак Кашоўнікі, Солы і Гнойніца. Зараз там адчынены мемарыял, а рэчы салдат перададзены ў музейны пакой. Афіцыйная інфармацыя пра баявы шлях 85-й стралковай дывізіі набывае асобасны характактар праз дэманстрацыю ўспамінаў генерал-майора Аляксандра Васільевіча Бандоўскага, франтавыя пісьмы вайскоўцаў. Наведвальнікаў узрушвае той факт, што нават і сёння (напрыклад, калі будавалі цэнтр «Трыніці»), знаходзяцца артэфакты тых жахлівых падзей.



Репозиторий ГрГМУ

Імя генерал-маёра А. В. Бандоўскага носіць адна з вуліц г. Гродна. У грамадскім транспарце жыхарам горада напамінаюць пра адвагу гэтага героя. Вядома, што ў складзе групы з 6 байцоў ён двойчы трапляў у палон, аднак здолеў вызваліцца [2]. У мікрараёне Вішнявец ёсць вуліца Стралковая, яна названа ў гонар усіх салдат і афіцэраў, што ў складзе дывізіі абаранялі нашу зямлю.

**Вывады.** Музейная зала ў сярэдняй школе № 34 г. Гродна – добры прыклад таго, як звычайны пакой ў школе стаў не толькі захавальнікам памяці, але і распаўсюджвальнікам нашай гісторыі. Музей выконвае ролю настаўніка па патрыятызму, ён прымушае ўспомніць і не забываць аб тым, праз што прайшоў народ Беларусі, нашы продкі, нашы сваякі. Ён нагадвае аб тым, што вайна забрала мільёны жыццяў і вельмі важна помніць іх імёны і не дапусціць паўтарэння такой крывавай гісторыі.

## Спіс літаратуры

1. Музейная комната // Средняя школа № 34 г. Гродно. – URL: https://sch34.oktobrgrodno.gov.by/ (дата обращения: 28.02.2026).

2. Бондовский Александр Васильевич // Иваново помнит. – URL: http://ivanovo1945.ru/bio_vet/v0049.html (дата обращения: 28.02.2026).

# ПОЛИТИКА ГЕНОЦИДА В БОБРУЙСКЕ В ГОДЫ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

**Долотенко Д.Е**

Витебский государственный ордена Дружбы народов медицинский университет

г. Витебск, Республика Беларусь

Научный руководитель – канд. мед. наук, доц. Тур А.В.

**Актуальность.** Политика геноцида, развязанная нацистской Германией на оккупированных территориях СССР, носила заранее спланированный характер. Белорусская Советская Социалистическая Республика, одной из первых принявшая на себя удар войны, стала ареной чудовищных преступлений против человечности. Важнейшим инструментом этой политики были лагеря смерти и места принудительного содержания, фактически превращённые в механизмы массового уничтожения людей. Одним из центров этой трагедии стал оккупированный Бобруйск, где за три года погибли десятки тысяч человек.

**Цель.** Раскрытие особенностей осуществления политики геноцида в Бобруйске в годы Великой Отечественной войны на основе анализа исторических источников и архивных материалов.



Репозиторий ГрГМУ